# КАЛЯНДАР ЮБІЛЕЙНЫХ І ПАМЯТНЫХ ДАТ

# МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ НА 2021 ГОД

**Дзяржынск,** горад, цэнтр раёна Мінскай вобласці (1146) — **875 г. з пачатку існавання**

**Слуцк,** горад, цэнтр Слуцкага раёна (1441) — **580 г. з часу атрымання граматы на магдэбурскае права**

**Халопенічы,** гарадскі пасёлак у Крупскім раёне (1451) — **570 г. з першага ўпамінання ў гістарычнах крыніцах**

**Стоўбцы,** горад, цэнтр Стаўбцоўскага раёна (1511) — **510 г. з часу першага ўпамінання ў гістарычных крыніцах**

**Алелькавіч Юрый** (каля 1531—1578), князь слуцкі, ваенны дзеяч, мецэнат — **490 г.**

**Капіевіч (Капіеўскі) Ілля** (1651, Міншчына — 1714), асветнік, перакладчык, выдавец, літаратар, паслядоўнік Ф. Скарыны, які адзін з першых распрацаваў для ўсходніх славян навуковую тэрміналогію па многіх галінах ведаў — **370 г.**

**Слуцкі тэатр Радзівілаў,** адзін з першых тэатраў Беларусі, у спектаклях якога прымалі ўдзел прафесійныя акцёры (1751—1760) — **270 г.**

**Чарноўскі Казімір** (1791, Чэрвеньскі р-н — 1847), адзін з вынаходнікаў падводнага карабля — **230 г.**

**Станкевіч Аляксандр Андрэевіч (у манастве Анатолій)** (1821, Міншчына — 1903), праваслаўны царкоўны дзеяч Беларусі, гісторык, публіцыст — **200 г.**

**Кіпрыяновіч Рыгор Якаўлевіч** (1851, Лагойскі р-н — пасля 1915), царкоўны гісторык, педагог — **170 г.**

**Кіш Алена Анатольеўна** (1896 (па іншых звестках 1889) Слуцкі р-н — 1949), народная мастачка, аўтар самаробных дываноў — **125 г.**

**Стампкоўская Алена** (1921, Салігорскі р-н — 1942), удзельніца Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, імем ягой названа вуліца ў Валгаградзе — **100 г.**

**Барысаўская макаронная фабрыка "Барымак"** (1931) — **90 г.**

# СТУДЗЕНЬ

**1- Маліноўскі Мікалай** (1921, Вілейс. р-н — 2018, вучоны ў галіне хірургіі, акадэмік РАМН, заслужаны дзеяч Узбекістана, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР — **100 г.**

**1- Казачэнка Мікалай** (1916, в. Бярозаўка, Чэрв. р-на — 1977), удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг., вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., абароны Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза — **105 г.**

**1- Калодзішчыметэаралагічная станцыя** (Мін. р-н, 1981) — **40 г. з пачатку дзейнасці**

**2- Зарэмба Міхась (Міхаіл)** (1941, в. Знаменка, Лагойскі р-н — 2002), пісьменнік, перакладчык, аўтар кніг аповесцей і апавяданняў для дзяцей, перакладаў творы рускіх і ўкраінскіх пісьменнікаў, раман Г. Уэлса "Чалавек-невідзімка" — **80 г.**

**6- Герасіменка Павел** (1976, г. Маладзечна), скульптар, аўтар твораў у мемарыяльнай, манументальнай і станковай скульптуры — **45 г.**

**8- Каханоўскі Генадзь** (1936, в. Дамашы, Маладзеч. р-н — 1994), вучоны-гісторык, археолаг, краязнаўца, фалькларыст, літаратуразнаўца, аўтар шэрагу літаратурна-краязнаўчых нарысаў, кніг па гісторыі гарадоў Беларусі — **85 г.**

**15- Шуба Павел** (1926, в. Танежыцы, Слуцкі р-н — 2000), мовазнаўца, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны — **95 г.**

**16- Вілейска-Мінская водная сістэма**, сістэма вадасховішчаў, каналаў, гідратэхнічных збудаванняў, прыродных вадаёмаў і вадацёкаў (Вілейскі, Маладзеч. і Мін. р-ны, 1976) — **46 г. з часу ўводу ў эксплуатацыю**

**17- Станкевіч Сяргей** (1961, г. Слуцк), танцоўшчык, заслужаны артыст Беларусі — **60 г.**

**23- Кананаў Міхаіл** (1906, г. п. Бобр, Круп. р-н — 1927), ваенны дзеяч, удзельнік савецка-фінлядскай вайны 1939—1940 гг., Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **115 г.**

**29- Шэлег Вольга** (1931, Стаўб. р-н — 1965), мовазнаўца, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР — **90 г.**

## ЛЮТЫ

**1- Мінскі абласны драматычны тэатр** (г. Маладзечна, 1991) — **30 г. з часу стварэння**

**1- Нарачанская геафізічная абсерваторыя Цэнтра геафізічнага маніторынгу НАН Беларусі** (в. Целякі Мядзел. р-н, 1981) — **40 г. з пачатку штодзённых назіранняў**

**1- Пратасеня Іван** (1931, в. Знамя, Слуцкі р-н), мастак-акварэліст, графік, сярод работ якога пейзажы, тэматычныя карціны, партрэты — **90 г.**

**1- Саломка Канстанцін** (1916, в. Узбалаць, Валож. р-н — 1990), мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (разьба па дрэву) — **105 г.**

**2- Хмялеўскі Аркадзь** (1921, Мін. р-н — 1987), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **100 г.**

**5- Алексютовіч Мікалай** (1921, Пухав. р-н — 1967), вучоны-філосаф, які адзін з першых даў навуковы аналіз светапогляду Скарыны і ўвёў у навуковы ўжытак творы беларускіх мысліцеляў XVI—XVII ст. — **100 г.**

**7- Ляўданскі Уладзімір** (1911, в. Гудавічы, Чэрв. р-н — 1973), пісьменнік, перакладчык — **100 г.**

**14- Русецкі Анатоль** (1951, г. Барысаў), вучоны ў галіне радыёэлектронікі і электроннага машынабудавання, дзяржаўны дзеяч Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **70 г.**

**15- Даніловіч Валянцін** (1936, п. Калодзішчы Мін. р-н — 1970), беларускі і расійскі выпрабавальнік парашутаў і катапультных сістэм, канструктар, майстар спорту СССР, мнагакратны рэкардсмен свету — **85 г.**

**17- Інстытут аховы раслін НАН Беларусі,** рэспубліканскае навуковае даччынае ўнітарнае прадпрыемства (Мін. р-н, 1971) — **50 г. з часу стварэння**

**17- Тышкевіч Канстанцін** (1806, г. Лагойск — 1868), археолаг, гісторык, этнограф, фалькларыст, краязнаўца, адзін з заснавальнікаў беларускай навуковай археалогіі, член Віленскай археалагічный камісіі — **215 г.**

**20- Самуэль Сафія** (1941, Нясвіж. раён), гісторык, журналіст, рэдактар, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **80 г.**

**20- Цесакоў Кім** (1936, г. Чэрвень — 2018), кампазітар, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Літаратурнай прэміі імя В. Віткі, ганаровы грамадзянін Чэрвеня — **85 г.**

**23- Парцянка Андрэй** (1906, в. Дуброўка, Круп. р-н — 1945), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **115 г.**

**23- Шпэт Язэп** (1891, в. Зембін, Барыс. р-н — 1955), пісьменнік, публіцыст — **130 г.**

**23- Шылай Расціслаў** (1936, в. Раўнаполле, Пухав. р-н — 2004), архітэктар, заслужаны архітэктар Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **85 г.**

**26- Козел Аляксандр** (1951, в. Лучынскія, Мін. р-н), скульптар, аўтар твораў у манументальнай, станковай і мемарыяльнай скульптуры — **70 г.**

**28- Малахаў Валерый** (1976, г. Салігорск), скульптар, аўтар твораў у станковай скульптуры, дэкаратыўнай і інтэр'ернай пластыцы — **45 г.**

## САКАВІК

**1- Пасюкевіч Уладзімір** (1931, г. Капыль — 2009), жывапісец, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі — **90 г.**

**1- Савік Лідзія** (1936, в. Камуна, Любан. р-н), літаратуразнаўца, крытык, культуролаг, даследчык праблем развіцця беларускай літаратуры ХХ ст., сучаснанага літаратурнага працэсу, спадчыны рэпрэсіраваных беларускіх пісьменнікаў, творчасці пісьменнікаў беларускага замежжа — **85 г.**

**5- Крапіва Кандрат (сапр. Атраховіч Кандрат)** (1896, в. Нізок Уздзен. р-н — 1991), драматург, байкапісец, празаік, мовазнаўца, грамадскі дзеяч, акадэмік НАН Беларусі, народны пісьменнік Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы, Герой Сацыялістычнай працы, узнагароджаны чатырма ордэнамі Леніна, удзельнік Першай сусветнай, савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў; яго імя носяць вуліцы ў Мінску, Гродне, Уздзе, Смаргоні — **125 г.**

**9- Скварцова Тамара** (1946, Слуцкі р-н) — актрыса, заслужаная артыстка Беларусі — **75 г.**

**11- Барысавец Канстанцін** (1921, Слуцкі р-н — 2011), вучоны-эканаміст, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі — **100 г.**

**14- Місько Павел** (1931, в. Знамя, Слуцкі р-н — 2011), пісьменнік, перакладчык, драматург — **90 г.**

**14- Каваленя Аляксандр** (1946, г. Капыль), вучоны-гісторык, педагог, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, выдатнік адукацыі Беларусі, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — **75 г.**

**15- Торык Мікалай** (1906, в. Перавоз, Слуцкі пав., Мін. губ (цяпер Капыл. р-н) — 1999), ваенны дзеяч, генерал-маёр берагавой службы, віцэ-адмірал, удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939-1940 гг., Вялікай Айчыннай вайны, кавалер ордэна Леніна, ганаровы грамадзянін Слуцка — **115 г.**

**16- Гарэлік Любоў** (1941, в. Хацянаўшчына, Мін. р-н), літаратуразнаўца, даследчык пытанняў сучаснага літаратурнага працэсу, аўтар навуковых прац, прсвечаных творчасці А. Пысіна, Р. Барадуліна, П. Броўкі, А. Звонака, М. Танка, А. Куляшова, П. Панчанкі, Я. Янішчыц і інш. — **80 г.**

**16- Кірычэнка Мікалай** (1946, г. Маладзечна — 2018), акцёр тэатра і кіно, народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, тэатральнай прэміі імя І. Буйніцкага, спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, педагог — **75 г.**

**18- Красоўскі Антон** (1821, г. Слуцк — 1898), расійскі вучоны ў галіне гінекалогіі і акушэрства, адзін з заснавальнікаў аперацыйнага акушэрства і гінекалогіі ў Расіі, педагог — **200 г.**

**22- Марцінкевіч Уладзімір** (1896, г. Крупкі — 1944), ваенны дзеяч, генерал-маёр, удзельнік Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг., Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **125 г.**

**29- Атрашкевіч Алена** (1966, г. Барысаў), кампазітар, аўтар музычна-тэатральных і вакальна-сімфанічных твораў, музычна-сцэнічных кампазіцый, педагог, дзяржаўны дзеяч, уладальніца знака Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь "За значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры" — **55 г.**

**30- Пяткевіч Аляксей** (1931, Стаўб. р-н), крытык, літаратуразнавец, краязнавец **— 90 г.**

## КРАСАВІК

**3- Валынец Мікалай** (1921, Слуцкі р-н – 2003), жывапісец, майстар пейзажа, адзін з лепшых партрэтыстаў Беларусі, стваральнік галерэі партрэтаў Герояў Савецкага Саюза, вядомых дзеячаў культуры, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны, сямю медалямі – **100 г.**

**3- Леснікові́ч Анатоль** (1941, Слуцкі р-н – 2003), вучоны-фізікахімік, акадэмік НАН Беларусі, вынаходнік, заслужаны работнік адукацыі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі – **80 г.**

**4- Зеленка Анатоль** (1941, Клецкі р-н – 1995), трэнер (грэка-рымская барацьба), заслужаны трэнер Беларусі і СССР – **80 г.**

**4- Русак Васіль** (1896, в. Ячава, Слуцкі р-н – 1946), грамадска-палітычны дзеяч, фальклярыст, выдавец, удзельнік Першай сусветнай вайны – **125 г.**

**5- Май Рышард** (1936, Клецкі р-н), мастак, працы якога знаходзяцца ў дзяржаўных калекцыях і прыватных калекцыях Беларусі, ЗША, Германіі, Францыі, Польшчы і іншых краін, заснавальнік і кіраўнік дзіцячай мастацкай студыі Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі "АРТ" г. Мінска, выхаванцы якой з'яўляюцца шматразовымі дапламантамі і прызёрамі міжнародных конкурсаў дзіцячай творчасці – **85 г.**

**5- Арланава Валерыя** (1971, г. Маладзечна), актрыса тэатра і кіно, заслужаная артыстка Беларусі – **50 г.**

**6- Філіповіч Арцём** (1901, Слуцкі р-н – 1961), вучоны ў галіне інфекцыйных хвароб, член-карэспандэнт АМН СССР – **120 г.**

**6- Казлова Вікторыя** (1936, г. Беразіно – 2005), рэжысёр тэатра лялек, чые пастаноўкі атрымалі ўзнагароды на ўсесаюзных і міжнародных фестывалях тэатраў лялек, педагог – **85 г.**

**6- Шупенька Генадзь** (1936, в. Падбярэззе, Мядзел. р-н – 2010), крытык, літаратуразнаўца, перакладчык, даследчык творчасці І. Мележа, Я. Брыля, Я. Скрыгана, Т. Хадкевіча, П. Місько, І. Пташнікава, А. Кудраўца, Ф. Янкоўскага, У. Калесніка і інш. – **85 г.**

**9- Свірыдаў Вадзім** (1931, Вілейс. р-н – 2002), вучоны-хімік, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі – **90 г.**

**15- Дашкевіч Вячаслаў** (1941, в. Дзякшняты, Маладзеч. р-н), паэт, журналіст – **80 г.**

**15- Гапановіч Віктар** (1921, Слуцкі р-н – 2009), вучоны-оталарынголаг, педагог, выдатнік аховы здароўя – **100 г.**

**16- Гладкая Валянціна** (1956, в. Праснакі, Капыл. р-н), спявачка, стваральніца і мастацкі кіраўнік заслужанага аматарскага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля "Неруш" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, збіральніца фальклору, заслужаны дзеяч культуры Беларусі – **65 г.**

**17- Радзівілаў Уладзімір** (1961, г. Узда), артыст гутарковага жанру, парадыст, заслужаны артыст Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны – **60 г.**

**23- Бядуля Змітрок (сапр. Самуіл Плаўнік)** (1886, в. Пасадзец, Лагойскі р-н – 1941), пісьменнік, чые творы ўвайшлі ў гісторыю беларускай літаратуры, сталі каштоўным здабыткам духоўнай культуры народа, перакладзены на мову народаў блізкага і далёкага замежжа, імем якога названы вуліцы ў Мінску, Віцебску, Жабінцы, Маладзечне – **135 г.**

**23- Нясвіж**, горад, цэнтр Нясвіжскага раёна, культурная сталіца Беларусі 2012 года (Нясвіж. р-н, 1223) – **435 г. з часу атрымання граматы на магдэбургскае права**

**26- Нафрановіч Аркадзь** (1936, в. Юшкавічы, Мядзел. р-н – 2015), пісьменнік, аўтар вершаў, паэм, апавяданняў, аповесцяў, нарысаў – **85 г.**

**28- Кісялёў Уладзімір** (1931, Пухав. р-н – 1996), краязнавец, заслужаны работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі – **90 г.**

**29- Ермаловіч Мікола (Мікалай)** (1921, Дзяржын. р-н – 2000), вучоны-гісторык, літаратуразнавец, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі – **100 г.**

## МАЙ

**"Музы Нясвіжа"**, рэспубліканскі фестываль камернай музыкі(г. Нясвіж, 1996) – **25 г. з пачатку правядзення**

**1- Сакольчык Адам** (1896, в. Вуглы, Мін. р-н – 1983), бібліёграф, бібліятэкар, педагог, удзельнік Першай сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў – **125 г.**

**4- Рунец Пятро (Пётр)** (1911, Пухав. р-н – 1997), пісьменнік – **110 г.**

**7- Крылоў Юрый** (1951, г. Вілейка — 2019), вучоны ў галіне анкалогіі, выдатнік аховы здароўя — **70 г.**

**9- Ліхадзіеўскі Сцяпан** (1911, в. Баслаўцы, Слуцкі пав., Мін. губ (цяпер в. Барок Слуцкі р-н) — 1979), паэт, літаратуразнаўца — **110 г.**

**9- Сюльжын Васіль** (1946, Пухав. р-н), спартсмен (вольная барацьба), трэнер, заслужаны майстар спорту СССР, заслужаны трэнер Беларусі — **75 г.**

**11- Фядзюшын Анатоль** (1891, г. Слуцк — 1972), вучоны ў галіне заалогіі, паразіталогіі, паляўніцтвазнаўстве і аховы прыроды, заслужаны дзеяч навукі Расіі, па праекце якога створаны Бярэзінскі біясферны запаведнік, заснавальнік заагеаграфіі Беларусі — **130 г.**

**12- Варанецкі Аляксандр** (1951, г. Маладзечна), акцёр цырка, клоўн, заслужаны артыст Беларусі і Расіі — **70 г.**

**15- Абабурка Мікалай** (1941, в. Морач, Клецкі р-н), мовазнаўца, педагог, даследчык актуальных пытаняў мовы мастацкай літаратуры і культуры маўлення, аўтар вучэбных дапаможнікаў для вышэйшай школы, шэрагу манаграфій і слоўнікаў-даведнікаў — **80 г.**

**15- Шацкі механічны завод** , РУП (Пухав. р-н, 1971) — **50 г. з часу заснавання**

**16- Вітка Васіль (сапр. Крысько Цімох)** (1911, в. Еўлічы, Слуцкі р-н — 1996), паэт, пісьменнік, крытык, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **110 г.**

**18- Крайко Аляксей** (1911, Пухав. р-н — 1943), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **110 г.**

**18- Корсак Юрый** (1941, г. Вілейка — 2003), піяніст, педагог, заслужаны артыст Беларусі — **80 г.**

**19- Акуловіч Леанід** (1941, Слуцкі р-н), вучоны ў галіне машынабудавання, вынаходнік, лаўрэат прэміі Савета Міністраў Беларусі, прэміі НАН Беларусі — **80 г.**

**16- Чарнаглазая Раіса** (1936, г. Слуцк), гісторык-дакументаліст, даследчык пытанняў гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны, аўтар і складальнік навуковых і навукова-папулярных кніг і альбомаў — **85 г.**

**27- Ламейка Уладзімір** (1966, г. Салігорск), скульптар, аўтар твораў у манументальнай, станковай, мемарыяльный, паркавай скульптуры — **55 г.**

**29- УА “Мар’інагорскі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж імя У. Е. Лабанка”**, установа адукацыі, якая рыхтуе спецыялістаў для сельскай гаспадаркі краіны (в. Мар’іна Горка , Ігуменскі павет, Мінская губерня (цяпер г. Мар’іна Горка, 1876 г.) — **145 г. з часу заснавання**

**31- Лойка Антон** (1746, г. Слуцк — 1801), танцоўшчык і балетмайстар, саліст прыдворнага тэатра Радзівілаў у Нясвіжы, педагог, аўтар шэрагу пастановак балетаў — **275 г.**

## ЧЭРВЕНЬ

**1- Далідовіч Генрых** (1946, в. Янкавічы, Стаўб. р-н), пісьменнік, лаўрэат Літаратурнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа — **75 г.**

**3- Шчэрба Уладзімір** (1961, Салігорск р-н — 2017), вучоны ў галіне машынабудавання, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **60 г.**

**5- Яловічава Ядвіга** (1946, Мін. р-н), вучоны-геолаг, географ, панінолаг, педагог, выдатнік адукацыі Беларусі — **75 г.**

**7- Беразіно**, горад, цэнтр Бярэзінскага раёна (1501) — **520 г. з часу першага ўпамінання ў гістарычных крыніцах**

**7- Альберс Юрый** (1951, г. Лагойск), трэнер (біятлон), майстар спорту СССР, заслужаны трэнер Беларусі — **70 г.**

**10- Фатыхава Галіна** (1946, в. Ігрушка, Круп. р-н), мастацтвазнаўца, аўтар і рэдактар шматлікіх артыкулаў для айчынных і замежных энцыклапедычных выданняў, манаграфій, нарысаў, эсэ, прысвечаных творчасці беларускіх мастакоў У. Уродніча, Я. Ждана, М. Ісаёнак, Я. Ражкова, Т. Батаковай-Матвеенка, В. Барабанцава, С. Давідовіча-Зосіна, А. Аракчэевай і інш., лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае адраджэнне”, ганаровая грамадзянка Крупскага раёна — **75 г.**

**12- Стэльмах Адольф** (1941, Маладзеч. р-н), вучоны ў галіне генетыкі раслін, лаўрэат прэміі АН Украіны імя В. Я. Юр’ева, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Украіны — **80 г.**

**12- Давідоўскі (Давыдоўскі) Іван** (1896, в. Грозава, Капыл. р-н — 1960), ваенны дзеяч, генерал-лейтэнант, удзельнік грамадзянскай і савецка-фінляндскай 1939-1940 гг. войнаў, вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, пяццю ордэнамі Чырвонага Сцяга — **125 г.**

**15- Гіль Мікола (сапр. Гілевіч Мікалай)** (1936, в. Слабада, Лагойскі р-н), пісьменнік, перакладчык, журналіст — **85 г.**

**15- Маркевіч Іван** (1936, Бярэз. р-н — 1981), паэт, аўтар лірычных вершаў, апавяданняў, нарысаў — **85 г.**

**15- Швайбовіч Уладзімір** (1946, Мін. вобл.), мастак, які працуе ў афармленчым мастацтве (вітраж, металапластыка, разьба па гіпсе) — **75 г.**

**16- Салігорскі краязнаўчы музей** , ДУК (1976) — **45 г. з часу заснавання (адкрыты 11.08.1984)**

**17- Літвінка Франя** (1941, г. Барысаў), мовазнавец, педагог, выдатнік народнай адукацыі — **80 г.**

**19- Ваўчок Людміла** (1981, г. п. Смілавічы, Чэрв. р-н), спартсменка (інваспорт, лыжныя гонкі, біятлон, адапцыйнае веславанне), чэмпіёнка і сярэбраны прызёр зімовых Паралімпійскіх гульняў, сярэбраны і бронзавы прызёр летніх Паралімпіёскіх гульняў, ганаровая грамадзянка Чэрвенскага раёна — **40 г.**

**21- Мірук Віктар** (1941, Барыс. р-н —2004), расійскі вучоны ў галіне ваенных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расіі — **80 г.**

**21- Бурдзявіцкая Святлана** (1946, Вілейскі р-н), трэнер (гімнастыка мастацкая), заслужаны трэнер Беларусі — **75 г.**

## ЛІПЕНЬ

**3- Міхалькевіч Таццяна** (1936, в. Паставічы, Старадар. р-н), беларускі майстар народнага ткацтва, народны майстар Беларусі — **85 г.**

**5- Лазарук Міхаіл** (1926, в. Ушаловічы, Слуцкі р-н — 2000), літаратуразнаўца, педагог, акадэмік НАН Беларусі, Акадэміі педагагічных навук СССР, замежны член Расійскай акадэміі адукацыі — **95 г.**

**10- Дземідовіч Павел** (1871, в. Мікалаеўшчына Стаўб. р-н — 1931), этнограф, фальклярыст, краязнаўца і педагог — **150 г.**

**13- Грышкевіч Аляксандр** (1961, г. Маладзечна), жывапісец, графік — **60 г.**

**21- Марціноўскі Антон (Антоній)** (1781, г. п. Радашковічы, Маладзеч р-н — 1855), рэдактар-выдавец, публіцыст, заснавальнік Віленскай друкарні (1817) — **240 г.**

**21- Юрэвіч Уладзімір** (1916, в. Дуброва, Смаляв. р-н — 2005), пісьменнік, літаратуразнаўца, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **105 г.**

**24- Астрэйка Анатоль (сапр. Акім)** (1911, в. Пясочнае, Капыл. р-н — 1978), паэт, перакладчык — **110 г.**

**27- Дасаева (дзявочае Жук) Таццяна** (1951, Слуцкі р-н), літаратуразнаўца і крытык — **70 г.**

**29- Гарадніцкі Яўген** (1951, аг. Ракаў, Валож. р-н), літаратуразнаўца, крытык, паэт — **70 г.**

**31- Ярэміч Аляксандр** (1876, г. Слуцк — 1920), урач, адзін з першаадкрывальнікаў унутрывеннага наркозу, культурна-грамадскі дзеяч, актыўны ўдзельнік Беларускага таварыства па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны ў Петраградзе — **145 г.**

## ЖНІВЕНЬ

**3- Адамовіч Алесь (Аляксандр)** (1926 (па іншых крыніцах 3.09.1927) в. Канюхі, Капыл. р-н — 1994), пісьменнік, крытык, літаратуразнаўца, грамадскі дзеяч, член-карэспандэнт НАН Беларусі, лаўрэат прэміі Міністэрства абароны СССР, Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа, кавалер ордэна “Знак Пашаны” — **95 г.**

**4- Гаркун Уладзімір** (1946, Дзярж. р-н), дзяржаўны дзеяч Беларусі, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі — **75 г.**

**5- Клецкая бітва 1506 г.** паміж войскамі Вялікага Княства Літоўскага на чале з М. Л. Глінскім і войскам крымскіх татар — **515 г. з часу першай перамогі ВКЛ над крымскімі татарамі**

**5- Сытчанка Уладзімір** (1951, г. Маладзечна), графік, жывапісец — **70 г.**

**5- Дзюбайла Павел** (1931, Бярэз. р-н — 1995), крытык, літаратуразнавец, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа — **90 г.**

**8- Надсан (сапр. Бучко) Аляксандр** (1926, г. Нясвіж ці г. п. Гарадзея — 2015), рэлігійны і грамадскі дзеяч беларускага замежжа, адзін з заснавальнікаў Згуртавання беларусаў Вялікабрытаніі, кіраўнік Беларускай бібліятэкі і музея імя Францыска Скарыны ў Лондане — **95 г.**

**8- Уласавец Аляксандр** (1901, Слуцкі р-н — 1945), удзельнік партызанскага руху ў грамадзянскую вайну 1918—1920 гг., удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **120 г.**

**10- Навіцкі Мікола (Мікалай Паўлавіч)** (1936, в. Крапужына, Лагойскі р-н), перакладчык, крытык, паэт — **85 г.**

**10- Смілавіцкі сельскагаспадарчы прафесіянальны ліцэй,** дзяржаўная ўстанова адукацыі (Чэрв. р-н, 1931) — **90 г. з часу прыняцця рашэння аб адкрыцці**

**11- Барысаўскі дзяржаўны каледж**, установа адукацыі (2006) — **15 г. з часу стварэння**

**15- Драздовіч Вікенцій** (1911, Капыл. р-н — 1942), удзельнік партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза — **110 г.**

**18- Брава Алена** (1966, г. Барысаў), пісьменніца, аўтар аповесцяў, апавяданняў, вершаў, журналіст — **55 г.**

**18- Марціновіч Алесь (Аляксандр)** (1946, в. Казловічы, Слуцкі р-н), літаратуразнаўца, крытык, публіцыст, краязнаўца, журналіст, празаік, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя К. Каліноўскага, Нацыянальнай літаратурнай прэміі — **75 г.**

**18- Плешчаніцкае камсамольска-маладзёжнае падполле ў Вялікую Айчынную вайну** (г. п. Плешчаніцы, Лайгоскі р-н; дзейнічала з 18 жніўня 1941 па 25 лістапада 1942) — **80 г. з пачатку дзеяння**

**21- Паслядовіч Макар** (1906, в. Караваева, Пухав. р-н — 1984), пісьменнік, аўтар гумарыстычных апавяданняў, літаратурных пародый, нарысаў, п'ес, твораў для дзяцей — **115 г.**

**23- Голуб Давыд** (1901, г. Чэрвень — 2001), вучоны ў галіне нармальнай анатоміі і эмбрыялогіі, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР — **120 г.**

**25- Холад Валянцін** (1936, в. Пятровічы, Смаляв. р-н), ваенны дзеяч, кантр-адмірал, Герой Савецкага Саюза — **85 г.**

**25- Лукашэвіч Уладзімір** (1946, Нясвіжскі раён), вучоны-філосаф, выдатнік адукацыі Беларусі — **75 г.**

**26- Радкевіч Аляксандр** (1916, в. Балгавічы, Капыл. р-н — 1957), ваенны дзеяч, удзельнік савецка-фінлядскай 1939—1940 гг. і Вялікай Айчыннай войнаў, Герой Савецкага Саюза — **105 г.**

**27- Новік-Пяюн (сапр. Новік) Сяргей** (1906, в. Лявонавічы, Нясвіж. р-н — 1994), паэт, празаік, кампазітар, культурна-асветны дзеяч, аўтар вершаў, апавяданняў, п’ес, каля сотні песень і рамансаў — **115 г.**

**27- Падгайскі Анатоль** (1946, Нясвіж. р-н — 1982), спявак (барытон), заслужаны артыст Беларусі — **75 г.**

## ВЕРАСЕНЬ

**3- Сергіевіч Мікола (Мікалай)** (1921, Салігор. р-н — 2000), пісьменнік, нарысіст — **100 г.**

**4- Дуброўскі (сапр. Чарняўскі) Ігнат** (1906, в. Дуброва, Смаляв. р-н — 2003), пісьменнік, вучоны ў галіне сельскагаспадарчых навук, заслужаны работнік культуры Беларусі — **115 г.**

**7- Булыга Уладзімір** (1936, в. Канюцічы, Мін. р-н), скульптар, мастак, які працуе ў галіне станковай і манументальный скульптуры, педагог, аўтар вучэбна-метадычных дапаможнікаў — **85 г.**

**10- Кныш Рэнальд** (1931, г. Капыль — 2019), трэнер (гімнастыка спартыўная), заслужаны трэнер Беларусі і СССР, заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларусі, ганаровы грамадзянін Гродна — **90 г.**

**10- Аўсянік Мечыслаў** (1941, Вілейскі р-н — 1999), расійскі і беларускі трэнер (лёгкая атлетыка), заслужаны трэнер Беларусі і СССР, заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларусі — **90 г.**

**17- Татур Генрых** (1846, г. Слуцк ці г. Мінск — 1907), археолаг, гісторык, краязнаўца, калекцыянер — **175 г.**

**18- Навахрост Аляксандр** (1951, Круп. р-н), кампазітар — **70 г.**

**23- Радзівіл (Сангушка) Ганна Кацярына** (1676, аг. Ракаў, Валож. р-н — 1746), гаспадарчая дзяячка Вялікага Княства Літоўскага, заснавальніца Налібоцкай і Урэцкай шкляных мануфактур, мецэнатка — **345 г.**

**30- Гілевіч Ніл** (1931, в. Слабада, Лагойскі р-н — 2016), паэт, літаратуразнаўца, фалькларыст, перакладчык, грамадскі дзеяч, народны паэт Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы і Міжнароднай прэміі імя Х. Боцева, узнагароджаны шматлікімі ордэнамі — **90 г.**

## КАСТРЫЧНІК

**1- Станюта Міхаіл** (1881, г. Чэрвень — 1974), жывапісец, педагог, творы якога ўпрыгожваюць музеі Беларусі, аўтар тэматычных карцін, партрэтаў, краявідаў, нацюрмортаў — **140 г.**

**6- Пашкевіч Аляксандр** (1946, г. Мар'іна Горка), мастак, які працуе ў розных жанрах станковага жывапісу, графіцы, педагог — **75 г.**

**8- Ельскі Міхаіл** (1831, в. Дудзічы, Пухав. р-н — 1904), скрыпач, кампазітар, музычны пісьменнік — **190 г.**

**10- Шаркова Ніна** (1951, Барыс. р-н), майстар мастацкага ткацтва, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **70 г.**

**12- Навіцкі Алег** (1971, г. Чэрвень), расійскі ваенны лётчык, касманаўт, камандзір касмічнага карабля "Союз ТМА-06М", палёт якога доўжыўся з 23 кастрычніка 2012 па 16 сакавіка 2013 г. і інш. палёты, Герой Расійскай Федэрацыі — **50 г.**

**21- Муравейка Іван** (1921, Любан. р-н), паэт, які праславіўся сваімі вершамі для дзяцей (некаторыя з іх пакладзены на музыку), аўтар нарысаў, франтавых запісак, апавяданняў, заслужаны работнік культуры Беларусі, выдатнік друку СССР, лаўрэат рэспубліканскай літаратурнай прэміі "Залаты Купідон" і прэміі імя В. Віткі — **100 г.**

**23- "Барысаўдрэў"**, ААТ, якое з'яўляецца старэйшым прадпрыемствам дрэваапрацоўчай галіны (у 1901 г. заснавана як Барысаўская запалкавая фабрыка "Бярэзіна") — **120 г.**

**27- Лобан Мікола (Мікалай)** (1911, в. Чапліцы, Слуцкі р-н — 1984), пісьменнік, мовазнаўца, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа — **110 г.**

**28- Ладуцька Іван** (1916, в. Стары Пруд, Чэрв. р-н — 2011), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ганаровы грамадзянін г. Калінкавічы — **105 г.**

## ЛІСТАПАД

**"Трасцянец"**, буйнейшае на тэрыторыі Беларусі месца масавага знішчэння беларускіх грамадзян, ваеннапалонных, партызан і падпольшчыкаў, яўрэяў Цэнтральнай і Заходняй Еўропы ў гады вялікай Айчыннай вайны (Мінскі раён, 1941—1944) — **80 г. з часу існавання**

**1- Уздзенскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей,** дзяржаўная ўстанова — **35 г. з часу адкрыцця для наведвальнікаў (заснаваны 06.02.1981)**

**7- Чарот Міхась (сапр. Кудзелька Міхаіл)** (1896, в. Рудзенск, Ігумен. пав., Мін. губ. (цяпер г. п. Рудзенск, Пухав. р-н) — 1937), паэт, празаік, драматург, публіцыст, грамадскі і культурны дзеяч, імя якога носяць вуліцы ў Гродне і Мінску — **125 г.**

**8- Богуш-Шышка Міхаіл** (1811, Мін. вобл. — 1877), гісторык, архівіст, перакладчык, заснавальнік Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў — **210 г.**

**8- Статкевіч-Чабаганаў Анатоль** (1946, в. Засмужжа, Любан. р-н — 2019), пісьменнік, краязнаўца, даследчык гісторыі шляхецкіх родаў Беларусі, грамадскі і культурны дзеяч, мецэнат, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскага конкурсу на лепшы літаратурны твор года “Залаты Купідон”, уладальнік знака Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь “За ўклад у развіццё культуры Беларусі”, кавалер ордэна свяціцеля Кірылы Тураўскага I ст., святой праведнай Сафіі, княгіні Слуцкай, Крыжа прападобнай Еўфрасінні Полацкай Беларускай Праваслаўнай Царквы — **75 г.**

**9- Каўрыга Францішак** (194, Маладзеч. р-н — 2016), дзяржаўны, гаспадарчы і грамадскі дзеяч Расіі і Беларусі, заслужаны машынабудаўнік Расіі — **80 г.**

**10- Шупеня Сцяпан** (1896, в. Нача, Барыс. пав., Мін. губ (цяпер Круп. р-н) — 1979), удзельнік Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, дзяржаўны дзеяч, кавалер ордэна Леніна, ганаровы грамадзянін г. Шчучын — **125 г.**

**13- Платун Антон** (1896, Нясвіж. р-н — 1938), дзяржаўны дзеяч Беларусі, акадэмік НАН Беларусі — **125 г.**

**17- Новікава Анастасія** (1981, г. Жодзіна), спартсменка, заслужаны майстар спорту Беларусі, чэмпіёнка і сярэбраны прызёр чэмпіянатаў свету, чэмпіёнка Еўропы, ганаровая грамадзянка Жодзіна, узнагароджаная ордэнам Пашаны — **40 г.**

**17- Багдановіч Янка (Іван)** (1906, в. Гірбінята, Валож. р-н — 1990), пісьменнік, мемуарыст — **115 г.**

**19- Марзон Уладзімір** (1881, г. Заслаўе — 1954), вучоны-хірург. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі, заслужаны ўрач Беларусі — **140 г.**

**19- Жураўкоў Міхаіл** (1961, г. Салігорск), вучоны ў галіне механікі і геамеханікі, выдатнік адукацыі — **60 г.**

**23- Тэраўскі Уладзімір** (1871, Слуцкі р-н — 1938), харавы дырыжор, кампазітар, фалькларыст, стваральнік аднаго з першых беларускіх харавых калектываў, аўтар музыкі да спектакляў, песень і рамансаў на словы Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі і інш., збіральнік, апрацоўшчык і папулярызатар беларускіх народных песень — **150 г.**

**24- Надашкевіч Ігар** (1956, в. Калодзішчы, Мін. р-н), мастак, які працуе ў розных жанрах станковага жывапісу — **65 г.**

**28- Захарэвіч Марыя** (1936, в. Навасёлкі, Мядзел. р-н), актрыса тэатра і кіно, педагог, народная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **85 г.**

**28- Любань,** горад, цэнтр раёна (упершыню ўпамінаецца ў гістарычных крыніцах у 1566 г., як мястэчка ў Ярэміцкай воласці Слуцкага княства Вялікага Княства Літоўскага), 1661 — **360 г. з часу атрымання магдэбурскага права**

**29- Дайнека Валерый** (1951, г. п. Рудзенск, Пухав. р-н), эстрадны спявак, музыкант, педагог, заслужаны артыст Беларусі — **70 г.**

## СНЕЖАНЬ

**1- Ражына Якаў** (1946, Валож. р-н — 2016), вучоны-матэматык, член-карэспандэнт НАН Беларусі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, Дзяржаўнай прэміі Беларусі, выдатнік народнай асветы Беларусі — **75 г.**

**4- Радзівіл Жыгімонт (Сігізмунд) Караль** (1591, г. Нясвіж — 1642), дзяржаўны і ваенные дзеяч ВКЛ, удзельнік вайны Рэчы Паспалітай са Швецыяй 1600—1629 гг., вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1632—1634 гг. — **430 г.**

**13- Капцюг Анатоль** (1951, г. Вілейка — 2020), архітэктар, сярод асноўных работ якога — шэраг жылых дамоў у Гродне, комплекс Свята-Дабравешчанскага кафедральнага сабора ў Ваўкавыску і інш. — **70 г.**

**13- Маляўка Мікола (Мікалай)** (1941, в. Мікалаеўшчына, Стаўб. р-н), паэт, перакладчык, аўтар шэрагу зборнікаў вершаваных і празаічных твораў (у т. л. для дзяцей), многія з якіх пакладзены на музыку і перакладзены на рускую і ўкраінскую мовы, лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова, спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскага конкурсу на лепшы літаратурны твор года "Залаты Купідон" – **80 г.**

**13- Кабушкін Мікалай** (1946, Слуцкі р-н), вучоны-эканаміст, педагог заслужаны работнік адукацыі Беларусі – **75 г.**

**15- Александровіч Сцяпан** (1921, г. Капыль – 1986), літаратуразнаўца, крытык, пісьменнік, краязнаўца, заслужаны работнік культуры Беларусі – **100 г.**

**17- Забродскі Сяргей** (1911, г. Нясвіж – 1980), вучоны ў галіне гідрадынамікі і цепла- і масаабмену, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі, заслужаны вынаходнік Беларусі – **110 г.**

**17- Дубінка Вячаслаў** (1941, г. Слуцк – 2010), пісьменнік, дзеяч народнага мастацтва ("выцінанка"), фатограф, аўтар фотанарысаў, шэрагу кніг прозы і публіцыстыкі – **80 г.**

**17- Равенскі Мікола (Мікалай)** (1886, в. Капланцы, Бярэз. р-н – 1953), кампазітар, аўтар музыкі да многіх вершаў беларускіх паэтаў, дырыжор, музычны крытык, фалькларыст, збіральнік і апрацоўшчык беларускіх народных песень, дзеяч беларускага замежжа – **135 г.**

**21- Барысаўскі аб'яднаны музей**, дзяржаўная ўстанова (1946 г., адкрыты ў снежні 1950 г.) – **75 г. з часу заснавання**

**21- Зан Тамаш** (1796, в. Мясата, Маладзеч. р-н – 1855), польскі паэт-рамантык, даследчык беларускага фальклору, геолаг, удзельнік вызваленчага руху ў Беларусі і Літве – **225 г.**

**21- Пешкур Іван** (1921, в. Вострава, Капыл р-н – 1980), мастак тэатра, жывапісец, аўтар лірычных пейзажаў, партрэтаў, акварэляў, кавалер ордэна "Знак Пашаны" – **100 г.**

**24- Крамко Аляксандр** (1961, г. Стоўбцы), музыкант, выканаўца на народных інструментах, заслужаны артыст Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны і ордэна Пашаны – **60 г.**

**24- Фаміных Яўген** (1906, г. Дзяржынск – 1977), ваенны дзеяч, генерал-лейтэнант танкавых войск, удзельнік вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, узнагароджаны двума ордэнамі Леніна – **115 г.**

**25- Луцэвіч Уладзіслава** (1891, в. Вішнева, Валож. р-н — 1960), літаратуразнаўца і культурны дзеяч, заснавальніца і першы дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, заслужаны дзеяч культуры Беларусі — **130 г.**

**26- Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі**, адзіны ў Беларусі спецыялізаваны цэнтр, які ажыццяўляе медыцынскую рэабілітацыю пацыентаў пасля завяршэння лячэння злаякасных пухлін малочнай залозы і іншых анкалагічных захворванняў (а. Гарадзішча, Мін. р-н; санаторый "Гарадзішча", 1991) — **30 г. з часу стварэння прафілакторыя**

**27- Астапеня Павел** (1901, Слуцкі р-н —1981), вучоны-гігіеніст, заслужаны дзеяч навукі Беларусі — **120 г.**

**29- Шабан Яўген** (1936, в. Калодзіна, Мядзел. р-н — 1982), паэт, драматург, акцёр, рэжысёр, стваральнік шэрагу тэлеспектакляў па матывах твораў класікаў беларускай літаратуры, аўтар перакладаў на беларускую мову твораў М. Шолахава, В. Шукшына, Н. Думбадзе — **85 г.**

**29- Юдо Софія** (1946 (па пашпартных даных — 05.07.1946), Вілейскі раён), бібліятэкар-бібліёграф, заслужаны дзеяч культуры Беларусі — **80 г.**

**30- Шут Мікалай** (1916, г. п. Плешчаніцы, Лагойскі р-н — 1977), лётчык, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны і вайны з Японіяй 1945 г., Герой Савецкага Саюза — **105 г.**